# ХАРТЫЯ САВЕТА ЕЎРОПЫ ПА АДУКАЦЫІ ДЛЯ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ГРАМАДЗЯНСТВА І АДУКАЦЫІ Ў ГАЛІНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА



Юрыдычныя дакументы

Рэкамендацыя CM/Rec (2010) 7 і тлумачальны мемарандум

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

# Хартыя Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека

Рэкамендацыя CM/Rec (2010) 7,
зацверджаная Камітэтам міністраў
Савета Еўропы 11 мая 2010 года,
і тлумачальны мемарандум

Выдавецтва Савета Еўропы

© Савет Еўропы, Кастрычнік 2010 ангельскае выданне: Council of Europe Charter on Education for Democratic Citizenship and Human Rights Education
ISBN 978-92-871-6898-6

© Савет Еўропы, Лістапад 2017 беларускі пераклад ISBN: 978-92-871-8539-6

Гэты пераклад апублікаваны Савет Еўропы, але пад выключнай адказнасцю перакладчыка (неафіцыйны пераклад).

Адтварэнне тэкстаў, якія змяшчаюцца ў дадзенай публікацыі, дазваляецца пры поўнай спасылцы на крыніцу, а менавіта Савет Еўропы. Калі гэтыя тэксты прызначаныя для выкарыстання ў камерцыйных мэтах або для перакладу на адну з неафіцыйных моў Савета Еўропы, просім звязацца з выдавецтвам па адрасе: publishing@coe.int

Partnership for Good Governance

EUROPEAN UNION — COUNCIL OF EUROPE / CONSEIL DE L'EUROPE

Меркаванні, выкладзеныя ў гэтай працы, належаць аўтарам і не абавязкова адлюстроўваюць афіцыйную палітыку Рады Еўропы і Еўрапейскага Звяза.

Беларускі пераклад і выпуск гэтай публікацыі прафінансаваны ў межах супольнага праекта з Еўрапейскім Звязам «Аб спрыянні адукацыі ў галіне правоў чалавека і дэмакратычнай грамадзянскасці ў краінах Усходняга партнёрства».

Council of Europe Publishing
F-67075 Strasbourg Cedex
http://book.coe.int
© Савет Еўропы, Верасень 2017
Выдадзена Саветам Еўропы

1. Рэкамендацыя CM/Rec (2010) 7, зацверджаная Камітэтам міністраў Савета Еўропы 11 мая 2010 года, па прапанове Кіруючага камітэта адукацыі (CDED).

2. Дадзеная публікацыя змяшчае тэкст Рэкамендацыі CM/Rec (2010) 7 і тлумачальны мемарандум да яе.

# Рэкамендацыя CM/Rec (2010) 7

## Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ адносна Хартыі Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека

*(Прынята Камітэтам Міністраў 11 мая 2010 на 120-й Сесіі)*

Камітэт міністраў, у адпаведнасці з палажэннямі артыкула 15.b Статута Савета Еўропы,

Нагадваючы аб асноўнай задачы Савета Еўропы - прасоўваць правы чалавека, дэмакратыю і вяршэнства закона;

Будучы цвёрда перакананы ў тым, што адукацыя і прафесійная падрыхтоўка адыгрываюць найважнейшую ролю ў выкананні гэтай задачы;

Прымаючы пад увагу права на адукацыю, замацаванае ў міжнародным праве, менавіта, у Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека (ETS № 5), Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах і Канвенцыі аб правах дзіцяці;

Нагадваючы, што Сусветная канферэнцыя па правах чалавека на сваім пасяджэнні ў Вене ў 1993 годзе заклікала дзяржавы ўключыць правы чалавека, дэмакратыю і вяршэнства закона ў навучальныя праграмы ўсіх адукацыйных установ у галіне фармальнай і пазафармальнай адукацыі;

Прымаючы пад увагу рашэнне, прынятае на 2-ім саміце кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Савета Еўропы (1997), аб высоўванні ініцыятывы аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства з мэтай садзейнічання ўсведамленню грамадзянамі сваіх правоў і абавязкаў у дэмакратычным грамадстве;

Нагадваючы аб Рэкамендацыі Rec (2002) 12 Камітэта міністраў аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і выказваючы імкненне працягваць працу на аснове гэтай Рэкамендацыі;

Прымаючы пад увагу рэкамендацыю Rec (2003) 8 Камітэта міністраў аб прасоўванні і прызнанні пазафармальнай адукацыі / навучання моладзі і

Рэкамендацыю Rec (2004) 4 адносна Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека ва універсітэцкай адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы;

Прымаючы пад увагу рэкамендацыю 1682 (2004) Парламенцкай Асамблеі аб адукацыі ў падтрымку Еўропы, у якой Асамблея заклікала распрацаваць Еўрапейскую рамачную канвенцыю аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека;

Адказваючы на заклік 7-й Канферэнцыі міністраў еўрапейскіх краін па справах моладзі, агучаны на пасяджэнні ў Будапешце ў 2005 годзе, у падтрымку прыняцця рамачнага палітычнага дакумента аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека;

Імкнучыся ўнесці ўклад у дасягненне мэтаў Сусветнай праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека, прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН у 2005 годзе, у якой Савет Еўропы выступае рэгіянальным партнёрам у Еўропе;

Выказваючы пажаданне развіваць вопыт Еўрапейскага года грамадзянскасці праз адукацыю 2005 года, падчас якога дзяржавы і няўрадавыя арганізацыі сабралі шматлікія прыклады эфектыўнай практыкі адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, а таксама ўмацаваць, кадыфікаваць і распаўсюджваць такую эфектыўную практыку па ўсёй Еўропе;

Зыходзячы з таго, што менавіта дзяржавы-члены нясуць адказнасць за арганізацыю і ўтрыманне сваіх сістэм адукацыі;

Прызнаючы пры гэтым ключавую ролю няўрадавых і моладзевых арганізацый у гэтай галіне адукацыі і імкнучыся падтрымліваць іх у сувязі з гэтым,

Рэкамендуе ўрадам дзяржаў-членаў:

– праводзіць мерапрыемствы, заснаваная на палажэннях Хартыі Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, як гэтя выкладзена ў дадатку да гэтай Рэкамендацыі;

– забяспечваць распаўсюджванне Хартыі сярод тых органаў, якія нясуць адказнасць за адукацыю і моладзь;

Даручае Генеральная сакратару перадаць гэтую рэкамендацыю:

– ўрадам краін-удзельніц Еўрапейскай культурнай канвенцыі (ETS № 18), якія не з'яўляюцца дзяржавамі-членамі Савета Еўропы;

– міжнародным арганізацыям.

**Дадатак да Рэкамендацыі CM/Rec (2010) 7**

*Хартыя Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека*

Прынята ў рамках Рэкамендацыі Камітэта міністраў CM/Rec (2010) 7

*Раздзел I - Агульныя палажэнні*

1. Галузь прымянення

Палажэнні гэтай Хартыі разглядаюць пытанні адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, у адпаведнасці з азначэннямі, выкладзенымі у пункце 2. Яна не тычыцца непасрэдна такіх звязаных галін, як міжкультурная адукацыя, адукацыя ў сферы роўнасці і адукацыя ў падтрымку ўстойлівага развіцця і міра, за выключэннем тых выпадкаў, калі яны перасякаюцца і ўзаемадзейнічаюць з адукацыяй для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыяй у галіне правоў чалавека

2. Тэрміны і азначэнні

У мэтах гэтай Хартыі

*a.* "Адукацыя для дэмакратычнага грамадзянства" азначае выхаванне, падрыхтоўку, адукацыю, інфармацыю, практыку і дзейнасць, накіраваныя, дзякуючы перадачы навучэнцам ведаў, навыкаў і разумення, а таксама развіццю іх пазіцый і паводзін, на пашырэнне іх магчымасцяў ажыццяўляць і абараняць свае дэмакратычныя правы і адказнасць у грамадстве, шанаваць разнастайнасць і адыгрываць актыўную ролю ў дэмакратычным жыцці з мэтай прасоўвання і абароны дэмакратыі і вяршэнства права.

*b.* "Адукацыя ў галіне правоў чалавека" азначае выхаванне, падрыхтоўку, адукацыю, інфармацыю, практыку і дзейнасць, накіраваныя, дзякуючы перадачы навучэнцам ведаў, навыкаў і разумення, а таксама развіццю іх пазіцый і паводзін, на пашырэнне іх магчымасцяў спрыяць стварэнню і

абароне агульнай культуры правоў чалавека ў грамадстве з мэтай прасоўвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабодаў.

*c.* "Фармальная адукацыя" азначае структураваную сістэму адукацыі і падрыхтоўкі, якая ахоплівае этапы да пачатковай школы, пачатковую школу, а таксама сярэднюю школу і універсітэцкую адукацыю. Як правіла, такуая адукацыя прадастаўляецца ў агульных або прафесійных навучальных установах і, па яе завяршэнні, выдаецца атэстат аб адукацыі.

*d.* "Пазафармальная адукацыя" абазначае любую запланаваную праграму адукацыі, закліканую пашырыць кола навыкаў і кампетэнцый, за межамі рамак фармальнай адукацыі.

*e.* "Нефармальная адукацыя" азначае працэс, які адбываецца на працягу ўсяго жыцця і падчас якога кожны чалавек выбудоўвае сваю пазіцыю, каштоўнасці, атрымлівае навыкі і веды пад уплывам адукацыі і фактараў свайго ўласнага асяроддзя, а таксама штодзённага вопыту (сям'і, групы аднагодкаў, суседзяў, у выніку сустрэч, у бібліятэцы, са СМІ, на працы, у гульні і г.д.).

### 3. Узаемасувязь паміж адукацыяй для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыяй у галіне правоў чалавека

Адукацыя для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыя ў галіне правоў чалавека не толькі цесна звязаныя паміж сабой, але і дапаўняюць адзін аднаго. Гэтыя напрамкі адукацыі адрозніваюцца, хутчэй, па асноўных акцэнтах і сферы ўжывання, а вось мэты і метады ў іх аднолькавыя. У адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства асноўная ўвага надаецца дэмакратычным правам, адказнасці і актыўнаму ўдзелу ў грамадзянскай, палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай, прававой і культурнай сферах жыцця грамадства, у той час як адукацыя ў галіне правоў чалавека ахоплівае больш шырокі спектр правоў чалавека і асноўных свабод усіх магчымых аспектаў грамадскага жыцця.

### 4. Канстытуцыйныя структуры і прыярытэты дзяржаў-членаў СЕ

Ніжэй пададзеныя задачы, прынцыпы і палітыкі прымяняюцца:

*a.* а.пры ўмове належнага захавання канстытуцыйных структур кожнай дзяржавы-члена з ужываннем сродкаў, якія адпавядаюць гэтым структурам.

*b.* пры ўмове уліку прыярытэтаў і патрэбаў кожнай дзяржавы-члена.

*Раздзел II - Задачы і прынцыпы*

5. Задачы і прынцыпы

Пры вызначэнні сваёй палітыкі, заканадаўства і практыкі дзяржавы-члены заклікаными кіравацца наступнымі задачамі і прынцыпамі.

*a.* Задача заключаецца ў тым, каб забяспечыць кожнай асобе, якая знаходзіцца на іх тэрыторыі, магчымасць атрымання адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека.

*b.* Працэс навучання ў рамках адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека адбываецца на працягу ўсяго жыцця. Эфектыўнае навучанне ў гэтай галіне ўключае шырокі спектр удзельнікаў, у тым ліку палітыкаў, спецыялістаў у сферы адукацыі, навучэнцаў, бацькоў, адукацыйныя ўстановы, органы адукацыі, дзяржаўных служачых, няўрадавыя і арганізацыі, СМІ і грамадскасць.

*c.* Усе сродкі адукацыі і падрыхтоўкі - фармальныя, пазафармальныя і нефармальныя - адыгрываць сваю ролю ў гэтым працэсе навучання і з’яўляюцца каштоўнымі для прасоўвання сваіх прынцыпаў і выканання пастаўленых задач.

*d.* Няўрадавыя і моладзевыя арганізацыі заклікаными ўнесці свой каштоўны ўклад у адукацыю дэмакратычнага грамадзянства і адукацыю ў галіне правоў чалавека, менавіта, на аснове пазафармальнай і нефармальнай адукацыі, таму ім неабходныя магчымасці і адпаведная падтрымка для таго, каб яны маглі зрабіць гэты ўклад.

*e.* Працэсы выкладання і навучання павінны адпавядаць каштоўнасцям і прынцыпам у сферы дэмакратыі і правоў чалавека і прасоўваць іх, менавіта кіраванне адукацыйнымі ўстановамі, уключаючы школы, павінна нагадваць і спрыяць каштоўнасцям правоў чалавека і пашыраць паўнамоцтвы і актыўны ўдзел у гэтым працэсе навучэнцаў, выкладчыкаў і зацікаўленых удзельнікаў, у тым ліку бацькоў.

*f.* Важным аспектам ўсяго комплексу адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека з’яўляецца садзейнічанне сацыяльнай згуртаванасці і міжкультурнаму дыялогу, а таксама павышэнне ролі разнастайнасці і роўнасці, у тым ліку гендэрнай роўнасці; для гэтага надзвычай важна развіваць веды,

асабістыя і грамадскія навыкі і ўзаемаразуменне, якія рэгулююць канфлікты, павышаюць узровень ацэнкі і разумення адрозненняў паміж рэлігійнымі і этнічнымі групамі, ствараюць ўзаемную павагу чалавечай годнасці і агульных каштоўнасцяў, заахвочваюць да дыялогу і спрыяюць негвалтоўнаму ўрэгуляванню праблем і спрэчак.

*g.* Адна з галоўных мэтаў любой адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека заключаецца не толькі ў тым, каб надзяліць навучэнцаў ведамі, разуменнем і навыкамі, але і ў тым, каб развіць гатоўнасць дзейнічаць у грамадстве з мэтай прасоўвання прынцыпаў правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права.

*h.* Пастаянная падрыхтоўка і развіццё ведаў спецыялістаў і моладзевых лідэраў у сферы адукацыі, а таксама саміх выкладчыкаў аб прынцыпах і практыцы адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека з'яўляецца жыццёва важнай часткай ажыццяўлення і забеспячэння ўстойлівага і эфектыўнага навучання; яны павінны адпаведным чынам планавацца і забяспечвацца рэсурсамі.

*i.* Варта заахвочваць партнёрства і супрацоўніцтва паміж шырокім колам зацікаўленых удзельнікаў, задзейнічаных ў прадастаўленні адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека на рэгіянальным і мясцовым узроўнях, такім чынам, каб атрымаць максімальную карысць з іх ролі, у тым ліку сярод палітыкаў, спецыялістаў у сферы адукацыі, навучэнцаў, бацькоў, адукацыйных устаноў, няўрадавых і моладзевых арганізацый, СМІ і грамадскасці.

*j.* Улічваючы міжнародны характар каштоўнасцяў і абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, а таксама агульных прынцыпаў, якія ляжаць у аснове дэмакратыі і вяршэнства права, важна, каб дзяржавы-члены спрыялі і развівалі міжнароднае і рэгіянальнае супрацоўніцтва ў дзейнасці, якую ахоплівае гэтая Хартыя, уключаючы выяўленне і абмен перадавым вопытам.

*Раздзел III - Палітыкі*

6. Фармальная агульная і прафесійная адукацыя

Дзяржавы-члены павінны ўключаць адукацыю для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыю ў галіне правоў чалавека ў навучальныя праграмы - у рамках фармальнай адукацыі на ўзроўні навучання да пачатковай адукацыі, на ўзроўні пачатковай і сярэдняй школьнай адукацыі, а таксама да агульнай і прафесійнай адукацыі і падрыхтоўкі. Дзяржавы-члены

павінны таксама падтрымліваць, праглядаць і абнаўляць асноўныя задачы і метады адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў гэтых навучальных праграмах для таго, каб забяспечваць іх актуальнасць і падтрымліваць ўстойлівы характар іх развіцця.

7. Вышэйшая адукацыя

Дзяржавы-члены закліканыя заахвочваць, з належным улікам прынцыпаў акадэмічных свабод, уключэнне адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў вышэйшых навучальных установах, у прыватнасці, для будучых спецыялістаў у галіне адукацыі.

8. Дэмакратычнае кіраванне

Дзяржавы-члены павінны спрыяць дэмакратычнаму кіраванню ва ўсіх адукацыйных установах, як жаданым і рэзультатыўнаму метадзе кіравання, і як практычным сродкі навучання дэмакратыі і захавання правоў чалавека. Яны павінны заахвочваць і спрыяць, адпаведнымі сродкамі, актыўным удзеле навучэнцаў, педагагічнага складу і зацікаўленых удзельнікаў, уключаючы бацькоў, ва ўпраўленні адукацыйнымі ўстановамі.

9. Прафесійная падрыхтоўка

Дзяржавы-члены павінны прадастаўляць настаўнікам, іншым работнікам сферы адукацыі, моладзевым лідэрам і выкладчыкам неабходную першасную і сістэматычную падрыхтоўку і развіццё ў сферы адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Гэта забяспечваецца прадастаўленнем паглыбленых ведаў і разуменнем задач і прынцыпаў гэтай дысцыпліны, а таксама адпаведных метадаў выкладання і навучання, у дадатак да іншых асноўных навыкаў, якія адпавядаюць іх галіне падрыхтоўкі.

10. Роля няўрадавых і моладзевых арганізацый і іншых удзельнікаў

Дзяржавы-члены павінны ўмацоўваць ролю няўрадавых і моладзевых арганізацый у адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, асабліва, што тычыцца пазафармальнай

адукацыі. Яны павінны прызнаваць гэтыя арганізацыі і іх дзейнасць як каштоўную частку сістэмы адукацыі, аказваць ім, калі гэта магчыма, неабходную падтрымку і ў поўнай меры выкарыстаць вопыт, які яны могуць перадаць ва ўсе формы навучання. Дзяржавы-члены павінны таксама заахвочваць і распаўсюджваць інфармацыю аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыю ў галіне правоў чалавека сярод іншых удзельнікаў, у прыватнасці, у СМІ і ў шырокіх колах грамадскасці, для таго каб мець магчымасць максімальна выкарыстоўваць той уклад, які яны здольныя зрабіць у гэтай галіне.

11. Крытэрыі ацэнкі

Дзяржавы-члены павінны распрацаваць крытэрыі ацэнкі для вызначэння эфектыўнасці навучальных праграм па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Неад'емнай часткай такіх ацэнак павінна быць зваротная сувязь з боку вучняў.

12. Даследчая дзейнасць

Дзяржавы-члены павінны заахвочваць і распаўсюджваць навуковыя даследаванні па пытаннях адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека з мэтай пераасэнсавання бягучай сітуацыі, якая склалася ў гэтай галіне і прадастаўлення адпаведным ўдзельнікам, у тым ліку палітыкам, адукацыйным установам, кіраўнікам школ, настаўнікам, вучням, няўрадавым і моладзевым арганізацыям параўнальных дадзеных, якія дазволяць ім ацаніць, павысіць эфектыўнасць і выніковасць, і ўдасканаліць сваю дзейнасць. Гэтыя даследаванні, *акрамя ўсяго іншага*, павінны ўключаць пытанні навучальных праграм, інавацыйнай практыкі, метадаў выкладання і развіцця сістэм ацэнак, у тым ліку крытэрыяў і паказчыкаў ацэнкі. Па меры мэтазгоднасці дзяржавы-члены павінны дзяліцца вынікамі гэтых даследаванняў з іншымі дзяржавамі-членамі і адпаведнымі ўдзельнікамі.

13. Навыкі ў прасоўванні сацыяльнай згуртаванасці, павагі да разнастайнасці і ў рэгуляванні разыходжанняў і канфліктаў

Ва ўсіх сферах адукацыі дзяржавы-члены павінны спрыяць выкарыстанню падыходаў і метадаў выкладання, накіраваных на навучанне жыццю ў дэмакратычным і культурным грамадстве, на атрыманне навучэнцамі ведаў і навыкаў у прасоўванні сацыяльнай згуртаванасці, павагі да разнастайнасці і роўнасці, станоўчай ацэнкі адрозненняў

- асабліва паміж рознымі рэлігійнымі і этнічнымі групамі, - а таксама на вырашэнне любых спрэчак і непаразуменняў негвалтоўным шляхам, паважаючы пры гэтым правы іншых, а таксама на барацьбу з усімі формамі дыскрымінацыі і гвалту і, перш за ўсё, з тымі, якія суправаджаюцца здзекаваннямі і пераследам.

*Раздзел IV - Ацэнка і супрацоўніцтва*

14. Ацэнка і агляд

Дзяржавы-члены павінны на рэгулярнай аснове ацэньваць стратэгіі і палітыку, якія яны ажыццяўляюць у рамках Хартыі, і адпаведным чынам адаптаваць такія стратэгіі і палітыку. Яны могуць рабіць гэта ў супрацоўніцтве з іншымі дзяржавамі-членамі, напрыклад, на рэгіянальнай аснове. Любая дзяржава-член можа таксама папрасіць дапамогі з боку Савета Еўропы.

15. Супрацоўніцтва ў наглядальным дзейнасці

Дзяржавы-члены павінны, калі гэта мэтазгодна, супрацоўнічаць адзін з адным і праз Савет Еўропы пры дасягненні мэтаў і рэалізацыі прынцыпаў, выкладзеных у гэтай Хартыі, шляхам:

*a.* правядзення работы па тэмах і вызначаным прыярытэтам, якія прадстаўляюць узаемную цікавасць;

*b.* ўмацавання шматбаковай і трансгранічнай дзейнасці, уключаючы існуючую сетку каардынатараў па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека;

*c.* абмену, развіцця, кадыфікацыі і забеспячэння распаўсюджвання перадавога вопыту;

*d.* інфармавання ўсіх адпаведных удзельнікаў, уключаючы грамадскасць, пра мэты і выкананне Хартыі;

*e.* падтрымкі еўрапейскіх сетак няўрадавых і моладзевых арганізацый, у тым ліку спецыялістаў у сферы адукацыі, а таксама шляхам супрацоўніцтва паміж імі.

16. Міжнароднае супрацоўніцтва

Дзяржавы-члены павінны абменьвацца вынікамі сваёй работы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў рамках Савета Еўропы з іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

# Тлумачальны Мемарандум - Рэкамендацыя Савета Еўропы адносна Еўрапейскай Хартыі па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека

## I. Перадумовы, вытокі і гісторыя вядзення перамоваў

1. Хартыя Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, прынятая ў рамках Рэкамендацыі Камітэта Міністраў CM/Rec (2010) 7, (далей па тэксце, «Хартыя») адзначае важны крок, які Савет Еўропы зрабіў у гэтым кірунку.

Штуршком да такога кроку стала рашэнне кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў дзяржаў-членаў СЕ, прынятае на Другім Саміце Савета Еўропы, які адбыўся ў Страсбургу 10-11 кастрычніка 1997 года, калі, у прыватнасці, было вырашана

> «стварыць ініцыятывы для выхавання дэмакратычнага грамадзянства шляхам павышэння дасведчанасці грамадскасці ў іх правах і абавязках як членаў дэмакратычнага грамадства». (Канчатковая Дэкларацыя).

Гэтае рашэнне адлюстроўвае падвышанне ўсведамлення ролі адукацыі ў прасоўванні асноўных каштоўнасцяў Рады Еўропы, а менавіта: дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона, а таксама папярэджання парушэнняў правоў чалавека. У больш агульным плане, адукацыя ўсё часцей разглядаецца як ахоўны механізм супраць росту гвалту, расізму, экстрэмізму, ксенафобіі, дыскрымінацыі і нецярпімасці. Акрамя таго, было шырока прызнана, што адукацыя ўносіць значны ўклад у сацыяльную згуртаванасць і сацыяльную справядлівасць. Рашэнне 2-га Саміту Арганізацыі прадаставіла мандат на распрацоўку шырокага спектру праграм супрацоўніцтва як у галіне грамадзянства і правоў чалавека, так і ў галіне фармальнай і нефармальнай адукацыі.

2. Рашэнне, прынятае на 2-ім Саміце, было рэалізавана на практыцы на палітычным узроўні, шляхам падрыхтоўкі Дэкларацыі і Праграмы дзеянняў па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства, якія былі прынятыя Камітэтам Міністраў на пасяджэнні ў Будапешце 7 мая 1999 года. У ходзе першага этапу праекта (1997-2000 гг.) розныя сектары

Савета Еўропы працавалі разам над распрацоўкай азначэнняў, асноўных паняццяў, метадаў, практык і матэрыялаў і над падтрымкай праектаў на нізавым узроўні («месца грамадзянства»). У кастрычніку 2000 года вынікі першага этапу праекта былі адобраныя міністрамі адукацыі на сустрэчы ў Кракаве. Яны пацвердзілі, што праект павінен працягвацца, а таксама заклікалі да захавання Рэкамендацыі Камітэта Міністраў у гэтай галіне..

3. Другі этап праекта (2001-2004 гг.) азнаменаваўся распрацоўкай палітык, стварэннем сеткі каардынатараў дзяржаў-членаў у галіне адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і падрыхтоўкай да Еўрапейскага Года грамадзянства праз адукацыю, які павінен быў адбыцца ў 2005 годзе. Другі этап праекта таксама адзначыўся важнай падзеяй, ухваленай у кастрычніку 2002 года, у адказ на просьбу згаданых вышэй міністраў адукацыі, Камітэтам Міністраў, а менавіта прыняццем Рэкамендацыі (2002) 12 краінаў-членаў Рады Еўропы адносна адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства.

4. Еўрапейскі Год грамадзянства праз адукацыю быў паспяхова праведзены ў 2005 годзе і адзначыўся істотным ростам дасведчанасці ва ўсіх дзяржавах-членах аб каштоўнасці адукацыі ў выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці, а таксама павелічэннем колькасці краін, дзе такая адукацыя з'яўляецца часткай вучэбнага плана і працяглых навучальных праграм. За гэты «Год» і ў ходзе Ацэначнай Канферэнцыі, якая адбылася ў Сінаі (Румынія) і завяршыла яго, дзяржавы-члены і НДА мелі ўнікальную магчымасць абменьвацца вопытам прымянення належнай практыкі ў галіне выхавання дэмакратычнага грамадзянства.

5. Нягледзячы на відавочны прагрэс у палітыцы і практыцы, якога дзяржавы-члены СЕ дасягнулі падчас Еўрапейскага Года грамадзянства праз адукацыю і які прадэманстраваў іх гатоўнасць выконваць рэкамендацыі, якія змяшчаюцца ў Рэкамендацыі (2002) 12, на ранніх этапах рэалізацыі праекта былі чутныя заклікі да стварэння больш істотнага дакумента ў гэтай галіне, які мог бы прыняць форму, якая абавязвае. У кастрычніку 2004 года Парламенцкая Асамблея рэкамендавала Камітэту Міністраў скласці Еўрапейскую рамачную канвенцыю аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека (рэкамендацыя Асамблеі 1682 (2004) па адукацыі ў Еўропе). У снежні 2004 года у «Вроцлаўскай Дэкларацыі», прынятай міністрамі, адказнымі за культуру, адукацыю, пытанні моладзі і спорту дзяржаў-удзельніц Еўрапейскай культурнай канвенцыі, гаворыцца пра тое, што «Савет Еўропы павінен

узмацніць сваю ролю цэнтра перадавога вопыту ў галіне палітыкі для прадастаўлення людзям ведаў, выхавання навыкаў і прынцыпаў жыцця ў дэмакратычным грамадстве... Для гэтага, выкарыстоўваючы традыцыйныя механізмы, неабходна ўсталяваць адпаведныя еўрапейскія стандарты ...». На 3-м Саміце Савета Еўропы, які адбыўся ў Варшаве ў ліпені 2005 года, кіраўнікі дзяржаў-членаў і ўрадаў заклікалі да «актывізацыі намаганняў Савета Еўропы ў галіне адукацыі моладзі па ўсёй Еўропе, шляхам павышэння яе якасці і садзейнічання, у прыватнасці, усеабдымнай адукацыі ў галіне правоў чалавека». На 22-й сесіі Пастаяннай канферэнцыі еўрапейскіх міністраў адукацыі (Стамбул, травень 2007), Старшыня Пастаяннай канферэнцыі міністраў адукацыі і культуры федэральных зямель, Германія, адзначыў, што ідэя падрыхтоўкі рамачнага палітычнага дакумента аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства/адукацыі ў галіне правоў чалавека не вельмі цікавіць Германію, паколькі сітуацыя, якая склалася ў розных дзяржавах-членах СЕ ў гэтай галіне, радыкальна адрозніваецца адна ад адной. Пры гэтым ён адзначыў, што Германія ўсведамляе, што многія краіны патрабуюць пэўных установак з боку Савета Еўропы па гэтым питанні, і яна перакананая, што кампраміс можна знайсці для ўсіх без выключэння краін.

6. У той жа час паралельна абмяркоўваліся і іншыя распрацоўкі ў галіне моладзевай палітыкі. У 2000 годзе была запушчана Моладзевая Праграма па адукацыі ў галіне правоў чалавека, мэтай якой была «адукацыя ў галіне правоў чалавека ў галіне моладзевай палітыкі і моладзевай практыкі». На сваёй 7-й канферэнцыі (верасень 2005) еўрапейскія міністры па справах моладзі заклікалі Савет Еўропы падрыхтаваць праект рэкамендацыі Камітэта Міністраў дзяржавам-членам Моладзевай Праграмы па адукацыі ў галіне правоў чалавека, прыцягваючы да гэтага моладзь, у якой былі б указаны палажэнні, якія тычацца ўмацавання еўрапейскага супрацоўніцтва ў галіне папярэджання гвалту і развіцця дэмакратыі на аснове вопыту Савета Еўропы, атрыманага ў выніку ажыццяўлення Моладзевай Праграмы па адукацыі ў галіне правоў чалавека. Камітэт міністраў у сваёй рэзалюцыі (2008) 23 аб моладзевай палітыцы Савета Еўропы яшчэ больш падкрэсліў цэнтральную ролю адукацыі ў галіне правоў чалавека ў рамках маладзевай палітыкі, ўстанаўлення правоў чалавека і дэмакратыі як аднаго з прыярытэтаў моладзевай палітыкі, у тым ліку «забеспячэнне поўнага захавання моладдзю правоў чалавека і чалавечай годнасці, а таксама заахвочвання іх абавязацельстваў у гэтых адносінах».

7. Іншым важным крокам Савета Еўропы ў гэтым кантэксце стала павышэнне цікавасці да міжкультурнага дыялогу, які ўсё больш і больш набывае папулярнасці у дзяржавах-членах і на якім сёння усё часцей нагалошвае Савет Еўропы, разглядаючы пытанне больш традыцыйных прыярытэтных абласцей развіцця. У прыватнасці, важнасць адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека для ўмацавання міжкультурнага дыялогу была адзначана ў «Белай кнізе па міжкультурнаму дыялогу», апублікаванай у 2008 годзе[1].

8. Адначасова адбываюцца глабальныя падзеі ў тым жа кірунку і ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Сусветная праграма адукацыі ў галіне правоў чалавека, зацверджаная Генеральнай Асамблеяй 10 снежня 2004 года, паставіла перад сабой амбіцыйныя мэты для ўмацавання і развіцця адукацыі ў галіне правоў чалавека, на першым этапе ў пачатковых і сярэдніх школах на ўзроўні дзяржаў-членаў. Савет Еўропы аказвае дапамогу Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у ажыццяўленні Сусветнай праграмы ў Еўропе ў рамках афіцыйнага пагаднення.

9. У адказ на гэтыя падзеі, калі Кіруючы Камітэт па адукацыі Савета Еўропы («ККА») зацвердзіў Праграму дзеянняў Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў рамках трэцяга этапу праекта на 2006-2009 гг., была ажыццёўлена падрыхтоўка «даследавання па пытанні мэтазгоднасці стварэння даведачнай асновы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства/адукацыі ў галіне правоў чалавека (адпаведныя традыцыйныя механізмы)». Асноўнай задачай дадзенага даследавання было вывучэнне неабходнасці прыняцця рамачнага дакумента ў гэтай вобласці; агляд існуючых рамачных дакументаў і механізмаў як у рамках Савета Еўропы, так і ў рамках іншых міжнародных арганізацый, з выяўленнем прабелаў і недахопаў; кансультацыі па пытанні канкрэтнай практычнай карысці новага рамачнага дакумента і правядзення кансультацый па пытаннях аб'ёму і варыянтаў формы і зместу такога дакумента.

10. Падрыхтоўку тэхніка-эканамічнага абгрунтавання мэтазгоднасці стварэння такога дакумента было даручана правесці эксперту пры падтрымцы неафіцыйнай групы экспертаў з некалькіх краін, а менавіта

1. «Белая кніга па міжкультурнаму дыялогу: Жыць разам у роўнай годнасці» , прынятая міністрамі замежных спраў 47 дзяржаў-членаў Савета Еўропы на 118-м Пасяджэнні міністраў (Страсбург, 6-7 мая 2008 года)

спецыялістаў у сферы адукацыйных і прадстаўнікоў моладзевых арганізацый. Вынікі праведзенага даследавання былі прадстаўлены ў красавіку 2007 года.

11. У даследаванні выкарыстоўваецца тэрмін «рамачны дакумент», які азначае міжнародны інструмент (абавязваючага ці неабавязваючага характару), адрасаваны дзяржавам, і які змяшчае ўзгодненыя стандарты і палітыкі, якіх варта прытрымлівацца ў галіне адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека. У ім, у прыватнасці, разглядаюцца асноўныя дзеянні Савета Еўропы ў галіне адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства, укаранелыя ў асноўнай місіі Савета па прасоўванні правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства закона; гаворыцца пра тое, што асноўная дзейнасць Савета Еўропы ва ўсіх абласцях, якія прадстаўляюць агульны інтарэс і агульныя дзеянні з боку яе дзяржаў-членаў (як правы чалавека, нацыянальных меншасцяў, сацыяльная палітыка, барацьба з тэрарызмам і г.д.), была нацэлена на распрацоўку рамачных дакументаў, у розных іх формах, якія б падахвочвалі да дзеянняў членаў на дзяржаўным узроўні і вызначалі шляхі распаўсюджвання перадавога вопыту і павышэння стандартаў па ўсёй Еўропе. У ходзе даследавання таксама быў праведзены агляд існуючых інструментаў, з выяўленнем прабелаў і недахопаў і вызначэннем сукупнай карысці, якую можа прынесці новы дакумент. Былі вывучаныя формы новага дакумента (абавязваючая ці неабавязваючая) і варыянты яго зместу.

12. Па выніках праведзенага даследавання было рэкамендавана перайсці да перамоваў і прыняцця прынцыповага рашэння аб форме і змесце новага рамачнага дакумента.

13. У 2007-2008 гг. вынікі даследавання былі ўпершыню прадстаўленыя Спецыяльнай кансультатыўнай групе па пытаннях адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека, а пазней мноству іншых органаў Савета Еўропы, кожны з якіх пракаментаваў гэтыя вынікі. У склад гэтых органаў, у прыватнасці, уваходзілі: Кіруючы камітэт па правах чалавека (ККПЧ), Аб'яднаны савет па справах моладзі (АССМ), Кіруючы камітэт па вышэйшай адукацыі (ККВА), каардынатары дзяржаў-членаў па пытаннях адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і правоў чалавека, Бюро кіруючага камітэта па адукацыі (ККА) і члены пленарнага пасяджэння ККА, якія далучыліся ў сакавіку 2008 года. Усе органы СЕ, якія праводзілі кансультацыі па гэтым пытанні,

перадавалі свае высновы ў ККА як органу, які нясе галоўную адказнасць за адукацыю.

14. За гэты перыяд, пры разглядзе пытання распрацоўкі рамачнага дакумента, склаліся пэўныя тэндэнцыі думак з гэтай нагоды. У прыватнасці, быў праведзены аналіз вынікаў даследавання, палітычнай і прававой асноў, бягучай сітуацыі, прабелаў і недахопаў існуючай структуры палітычных дакументаў. Таксама быў зроблены вывад аб тым, што новы дакумент можа прынесці значную выгаду. Што тычыцца зместу такога дакумента, было праведзена шмат абмеркаванняў яго аб'ёму, неабходнасці дакладна вызначыць ключавыя тэрміны, і што такі дакумент павінен змяшчаць раздзелы, у якіх былі б выкладзеныя ўсе мэты, прынцыпы і палітыкі, дакладны сэнс якіх неабходна будзе дэталёва абмеркаваць у будучыні. Менш згоды дасягнулі па пытанні прымянення механізму вонкавага маніторынгу, з патрабаваннем, згодна з якім дзяржавы павінны прадстаўляць рэгулярныя справаздачы аб выкананні імі новага дакумента на разгляд экспертнай камісіі Савета Еўропы, якая магла б выказаць свае заўвагі і рэкамендацыі. Некаторыя думалі, што гэта прынясе значныя выгады, іншыя – што гэта накладвала бы непатрэбны груз на плечы дзяржаў. Што тычыцца формы дакумента, то думкі таксама падзяліліся: некаторыя аддалі перавагу абавязваючай, а некаторыя – неабавязваючай форме гэтага дакумента..

15. На сваім пленарным пасяджэнні 10 сакавіка 2008 ККА як орган, які пачаў даследаванні, улічваючы ўсе заўвагі іншых органаў, прывітаў яго запуск і прыняў рашэнне «працягнуць абмеркаванне пытання стварэння рамачнага дакумента шляхам падрыхтоўкі праекта дакументу у двух – абавязваючай і неабавязваючай – формах, і з улікам вынікаў работы Спецыяльнай кансультацыйнай групы па пытаннях адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека па ключавых пытаннях для палітычных дзеячаў». ККА таксама адправіў некаторых яго членаў у склад рэдакцыйнай групы і папрасіў Сакратарыят прызначыць іншых членаў, якія маюць вопыт у галіне адукацыі і моладзі. Ён папрасіў даць два варыянты праекта, якія будуць разгледжаны на пасяджэнні ККА ў сакавіку 2009 года.

16. Рэдакцыйная група правяла тры нарады: у чэрвені, верасні і лістападзе 2009 года. На першай нарадзе члены групы абмяняліся думкамі па прававой і агульнай формах і змесце двух праектаў, і вырашылі даручыць аўтару ТЭА падрыхтаваць першыя праекты двух тэкстаў. На

другой нарадзе былі ўпершыню разгледжаныя абодва праекты дакументаў і прадастаўленыя шматлікія каментары, якія былі ўлічаныя пры распрацоўцы новых праектаў дакумента, прадстаўленых на трэцяй нарадзе, падчас якой былі вывучаныя ўсе тэксты і знойдзеныя кампрамісы амаль па ўсіх спрэчных пытаннях. На разгляд Бюро ККА на яго снежаньскім паседжанні было перададзена толькі некалькі пытанняў. Бюро зрабіла свой выбар і ўхваліла праекты, якія, у сваю чаргу, былі перададзеныя на разгляд пленарнага пасяджэння ККА.

17. На пленарным пасяджэнні ККА ў сакавіку 2009 года былі прадстаўленыя два праекты тэксту. Па сутнасці, яны былі амаль ідэнтычныя, улічваючы, што патрэбы і мэты, якія павінны быць выкананы, былі аднолькавымі. Адрозненні складаліся толькі ў форме і юрыдычнай сіле тэкстаў дакумента, адзін з якіх меў абавязваючы характар і быў складзены на мове абавязацельства, а другі – неабавязваючага характару і змяшчаў больш мяккія формы мовы (на англійскай мове «варта было б», а не «павінны»). Адзінае істотнае адрозненне ў змесце знаходзілася ў раздзеле маніторынгу, з праектам канвенцыі, які прадугледжвае механізм справаздачнасці дзяржаў і вонкавага назірання, хоць і ў палегчанай форме, у той час як праект Хартыі абапіраўся больш на самаацэнку дзяржавамі.

18. У ходзе далейшага абмеркавання ўсе прадстаўнікі дзяржаў, якія выступалі, пагадзіліся з тым, што новы дакумент павінен быць прыняты і пераважная большасць прагаласавала за яго неабавязваючую форму. Адпаведна 20 сакавіка 2009 года Камітэтам было прынята рашэнне, у якім:

> «Камітэт:
>
> – з задавальненнем адзначыў вынікі работы рэдакцыйнай групы, якая падрыхтавала рамачны дакумент;
>
> – разгледзеў две прапановы, вылучаныя групай, і аддаў перавагу Хартыі аб адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека;
>
> – адзначыў карысці такой Хартыі для забеспячэння ўстойлівага развіцця палітыкі і практыкі ў галіне адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і правоў чалавека ва ўсіх дзяржавах-членах;
>
> – распрацаваў дарожную карту для дапрацоўкі Хартыі да правядзення пленарнага пасяджэнні ККА ў 2010 годзе ...».

19. Першы этап дарожнай карты прадугледжваў запрашэнне ўсіх дэлегацый да прадстаўлення прапаноў аб унясенні паправак да існуючага тэксту Хартыі з вызначаным тэрмінам прадастаўлення такіх прапаноў, якія будуць разгледжаныя невялікай групай у складзе цяперашніх і былых кіраўнікоў ККА з удзелам аўтара ТЭА і дэлегацый, якія прапанавалі ўнясенне такіх паправак і хацелі прыняць удзел у працэсе распрацоўкі Хартыі. Гэтая група збіралася ў чэрвені 2009 года і разглядала ўсе прапанаваныя папраўкі, некаторыя з якіх былі адобраныя, а іншыя адхіленыя. У некаторых выпадках групай былі ўнесены істотныя змены, дзе прапанаваная папраўка прымалася за аснову, а ў некаторых змены праводзіліся па ўласнай ініцыятыве групы.

20. Пасяджэнне Бюро ККА праводзілася 9-10 верасня 2009 года, на якім Камітэт разгледзеў тэкст дакумента ў той рэдакцыі, у якой ён выйшаў па выніках сустрэчы ў чэрвені з улікам рэкамендацый юрыдычнага аддзела Савета Еўропы ад 4 верасня 2009 г. Сутнасць гэтай рэкамендацыі заключалася ў тым, што для адпаведнасці палітыцы Савета Еўропы гэтая Хартыя павінна быць прынятая ў рамках Рэкамендацыі Камітэта Міністраў. Бюро накіравала перагледжаны праект дакумента і рэкамендацыі юрыдычнага аддзела на разгляд пазачарговага пасяджэння ККА, якое адбылося 10-11 снежня 2009 р. Ён таксама прыняў да ведама першы праект гэтага Тлумачальнага Мемарандума, і накіраваў яго на разгляд пленарнага пасяджэння. Членам ККА было прапанавана прадастаўляць заўвагі і прапановы адносна ўнясення змяненняў да любога з прадстаўленых на разгляд тэкстаў.

21. На сваім снежаньскім паседжанні ККА разгледзеў прапанаваныя папраўкі да тэксту Хартыі. Ён ухваліў версію дакумента з улікам рэкамендацыі юрыдычнага аддзела, згодна з якой Хартыя стала дадаткам рэкамендацыі Камітэта Міністраў, а прэамбула Хартыі ўступіла ў сілу прэамбулы рэкамендацыі. Было адзначана, што гэты фармат паставіць кропку ў пытанні неабавязваючага характару Хартыі, паколькі ўсе рэкамендацыі носяць неабавязваючы характар. Таксама былі прыняты некаторыя іншыя змены ў тэкст Хартыі. ККА абмеркаваў прапанаваныя папраўкі да Тлумачальнага Мемарандума і распарадзіўся падрыхтаваць яго абноўленую версію.

22. На сваім пасяджэнні 24-26 лютага 2010 Камітэт разгледзеў канчатковы варыянт праекта рэкамендацыі Камітэта Міністраў дзяржавам-членам адносна Еўрапейскай Хартыі па адукацыі для дэмакратычнага

грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека і яго Тлумачальнага Мемарандума. Было прынята рашэнне зацвердзіць праект рэкамендацыі і накіраваць яго ў Камітэт Міністраў з мэтай яго прыняцця. Камітэт прыняў да ведама тлумачальную запіску да праекта рэкамендацыі і пастанавіў накіраваць яго Камітэту Міністраў для інфармацыі.

## II. Каментары да палажэнняў Рэкамендацыі і Хартыі

*Рэкамендацыя: Прэамбула і заключныя палажэнні*

